# Дзяржаўнай камісіяй прыняты рашэнні аб выдзяленні радыёчастотнага спектру аператарам ў дыяпазонах 1800 Мгц і 2100 Мгц

21 сакавіка Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган прыняў удзел у пасяджэнні Дзяржаўнай камісіі па радыёчастотах пры Савеце Бяспекі Рэспублікі Беларусь, на якім прадставіў прапановы Мінсувязі, узгодненыя з аператарамі сотавай рухомай электрасувязі, па пытаннях выдзялення аператарам радыёчастотнага спектру ў дыяпазонах 1800 Мгц (СТАА «Беларускія хмарныя тэхналогіі») і 2100 Мгц (унітарнае прадпрыемства «Велком», СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы»), у мэтах далейшага развіцця сетак UMTS (3G) і LTE ва ўмовах эканомнага і эфектыўнага выкарыстання спектру. Названыя прапановы знайшлі адлюстраванне ў праектах рашэнняў Дзяржаўнай камісіі, вынесеных на яе разгляд.

Дзяржаўнай камісіяй рашэння аб выдзяленні радыёчастотнага спектру аператарам ў дыяпазонах 1800 Мгц і 2100 Мгц прынятыя.

Рэалізацыя рашэнняў дазволіць:

- завяршыць размеркаванне радыёчастотнага спектру паміж аператарамі сотавай рухомай электрасувязі ў дыяпазонах 1800 МГц і 2100 МГц, што з'яўляецца значным вынікам работы Дзяржаўнай камісіі, дазволіць Мінсувязі эфектыўна забяспечыць іх міжнародную прававую абарону;
- атрымаць значныя грашовыя сродкі ў рэспубліканскі бюджэт за выдзяленне і выкарыстанне радыёчастотнага спектру;
- павялічыць прапускную здольнасць сетак 3G, 4G і пераразмеркаваць (збалансаваць) нагрузку паміж імі, што станоўча адаб'ецца на якасці прадастаўлення паслуг сувязі;
- стварыць роўныя ўмовы гаспадарання аператараў сотавай сувязі, што ўмацуе канкурэнцыю і павялічыць інвестыцыі аператараў у інфраструктуру сетак.

Акрамя таго, Канстанцін Шульган праінфармаваў членаў Дзяржаўнай камісіі пра перспектывы ўкаранення ў Рэспубліцы Беларусь сетак сувязі па тэхналогіі 5G (IMT-2020) у мэтах далейшага развіцця сетак сотавай рухомай электрасувязі і задавальнення патрэбаў прамысловых прадпрыемстваў.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/21-03-2019-4249*